# ДА ПЫТАННЯ ЗАКЛЮЧЭННЯ САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ УЗГАДНЯЛЬНАЙ КАНВЕНЦЫІ Ў ЛІПЕНІ 1932 г.

**В. М. Бароўская**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі,*
*вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

У артыкуле разгледжаны асноўныя этапы па заключэнні «Дагавора аб ненападзенні» паміж СССР і Польшчай 25 ліпеня 1932 г. і ўзгадняльнай канвенцыі, іх ўплыў на агульную растаноўку сіл ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Падкрэсліваецца жаданне савецкага кіраўніцтва па выкарыстанні двухбаковых перагавораў у паляпшэнні гандлёва-эканамічных адносін Польшчы і СССР; і польскага кіраўніцтва на захаванні цэласнасці савецка-польскай мяжы. Дзеля дасягнення кампрамісу бакі імкнуліся пэўны час залагоджваць спрэчныя двухбаковыя пытанні (праблема свабоднага культурнага і рэлігійнага развіцця нацыянальных меншасцей, ліквідацыі антысавецкіх элементаў у Польшчы).

***Ключавыя словы:*** узгадняльная канвенцыя; дагавор аб ненападзенні; арбітраж; калектыўная бяспека.

# ON THE ISSUE OF CONCLUDING THE SOVIET-POLISH CONCILIATION CONVENTION IN JULY 1932

**O. Borovskaya**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*1 Academicheskaya Street, Minsk 220072, Belarus, borovskaya-olga@mail.ru*

The article examines the main stages of the conclusion of the «Non-Aggression Pact» between the USSR and Poland on July 25, 1932 and the conciliation convention, their impact on the overall deployment of forces in the Eastern European region. The desire of the Soviet leadership to use bilateral negotiations to improve trade and economic relations between Poland and the USSR is emphasized, and the Polish leadership to preserve the integrity of the Soviet-Polish border. In order to reach a compromise, the parties tried for some time to settle controversial bilateral issues (the problem of free cultural and religious development of national minorities, the elimination of anti-Soviet elements in Poland).

***Keywords:*** conciliation convention; non-aggression pact; arbitration; collective security.

# К ВОПРОСУ ЗАКЛЮЧЕНИЯ СОВЕТСКО-ПОЛЬСКОЙ СОГЛАСИТЕЛЬНОЙ КОНВЕНЦИИ В ИЮЛЕ 1932 Г.

**В. М. Боровская**

*Институт истории НАН Беларуси,*
*ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

В статье рассмотрены основные этапы по заключению «Договора о ненападении» между СССР и Польшей 25 июля 1932 г. и согласительной Конвенции, их влияние на

общую расстановку сил в восточноевропейском регионе. Подчеркивается желание советского руководства по использованию двусторонних переговоров в улучшении торгово-экономических отношений Польши и СССР; и польского руководства на сохранении целостности советско-польской границы. Для достижения компромисса стороны стремились определенное время задабривать спорные двусторонние вопросы (проблема свободного культурного и религиозного развития национальных меньшинств, ликвидации антисоветских элементов в Польше).

**Ключевые слова:** согласительная конвенция; договор о ненападении; арбитраж; коллективная безопасность.

Перагаворы па заключэнні «Дагавора аб ненападзенні» і ўзгаднянальнай канвенцыі адбываліся ў 1925–1932 гг. шляхам сустрэч паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Польшчы (П. Л. Войкава) з прадстаўнікамі Міністэрства замежных спраў Польшчы (міністрам, віцэ-міністрам, дырэктарам Усходняга дэпартамента Г. Янкоўскім); прадстаўніка Польшчы ў СССР (С. Кентшыньскі, С. Патэк) з членамі Калегіі НКЗС СССР (аддзел Польшчы і Прыбалтыкі С. І. Аралаў – Б. С. Стаманякоў, рэдка народным камісарам замежных спраў).

У савецка-польскіх перагаворах па заключэнні «Дагавора аб ненападзенні» варта вылучыць пэўную перыядызацыю:

1) 1925–1927 гг. – этап першапачатковага агучвання абодвума бакамі сваіх пазіцый адносна будучага пакта аб ненападзенні (польская пазіцыя аб падключэнні да савецка-польскага дагавора яшчэ і краін Прыбалтыкі, Румыніі супрацьпастаўлялася савецкім жаданнем паступовага заключэння савецка-польскага, савецка-латвійскага, савецкага-літоўскага і савецка-эстонскага дагавораў);

2) 1927–1931 гг. – перыяд лавіравання і адначасовага зацягвання перагавораў, калі абодва бакі не жадалі ісці на пэўныя ўступкі, аднак пад уплывам зменаў у агульнай міжнароднай сітуацыі (заключэння пакта Брыяна-Келага, Маскоўскага пратакола) маскіравалі свае сапраўдныя памкненні перад шырокімі коламі грамадскасці;

3) 1931–1932 гг. – этап канструктыўнага дыялогу і дэталёвых перагавораў па карэктыроўцы тэкста дагавора, знаходжанне кампрамісу па ўзгаднянальнай працэдуры.

Галоўным пунктам заключэння «Дагавора аб ненападзенні» была ўмова аб «інтэгральным і найбольш хуткім ажыццяўленні тых пастаноў Рыжскага мірнага дагавора, якія да гэтага моманту не былі выкананы». Савецкі бок жадаў «звязаць выкананне старых абавязацельстваў па Рыжскім дагаворы не толькі з палітычнага пункта гледжання, але, у асаблівасці, з гандлёвага». У першую чаргу мелася на ўвазе прадстаўленне эканамічных кампенсацый пры ліквідацыі старых польскіх прэтэнзій па Рыжскім дагаворы. Польскі бок выстаўляў патрабаванне – «забеспячэнне і ўмацаванне трывалага міру на тэрыторыі Усходняй Еўропы» удзел у заключэнні сістэмы гарантыйных дагавораў паміж СССР і краінамі Прыбалтыкі. Савецкі бок лічыў больш рацыянальным ажыццяўленне «папярэдніх размоў неафіцыйнага характару, г. зн. без аб'яўлення аб тым, што пачаты афіцыйныя перагаворы аб пак-

це. Падчас гэтых папярэдніх перагавораў выявіцца магчымасць зразумець сапраўдныя намеры бакоў» [1, s. 490].

3 сакавіка 1925 г. у «Інструкцыі міністра замежных спраў Польшчы для дыпламатычных пляцовак адносна польска-савецкіх адносін у апошнім паўгоддзі» А. Скшыньскі адзначаў, што «галоўнай мэтай польскай палітыкі ў адносінах да савецкага ўраду з'яўляецца імкненне да захавання міру, а таксама трывалага прытрымлівання створанага дзякуючы мірнаму дагавору тэрытарыяльнай сістэмы ўздоўж заходняй мяжы СССР ад магчымасці яго сілавога парушэння з боку савецкага ўраду». Формула, якая б дазволіла б захаванне статус кво, магла б стаць выхадам да пабудовы больш-менш нармальных адносін суседскага суіснавання паміж Польшчай і СССР, засноўвалася з аднаго боку на захаванні міру і пазбяганні вайны, з другога – неабходнасці прытрымлівання супрацоўніцтва з Румыніяй і краінамі Прыбалтыкі [1, s. 518].

Новая фаза савецка-польскіх перагавораў па заключэнні «Дагавора аб ненападзенні» пачалася ў студзені 1927 г. у сувязі з прыездам новага польскага паўнамоцнага прадстаўніка ў СССР С. Патэка. Польскі бок выказваў зацікаўленасць у падпісанні не толькі савецка-польскага пакта, але і аналагічных з краінамі Прыбалтыкі. 26 лютага 1927 г. у лісце члена Калегіі НКЗС СССР Б. С. Стаманякова паўнамоцнаму прадстаўніку СССР у Польшчы П. Л. Войкаву ўказвалася на адцягванне польскім урадам пачатку перагавораў. Забойства П. Л. Войкава ў Варшаве 7 чэрвеня 1927 г. прыпынілі двухбаковыя ініцыятывы ў гэтым кірунку.

У лісце Б. С. Стаманякова Д. В. Багамолаву ад 1 лістапада 1927 г. указвалася, што падчас абмеркавання пытання заключэння пакта аб ненападзенні паміж СССР і Польшчай было вырашана не рабіць ніякіх далейшых сур'ёзных уступак Польшчы па спрэчных пытаннях, праяўляючы адначасова былую зацікаўленасць у перагаворах і прымаючы ўсе меры, каб адказнасць за магчымы непоспех перагавораў лягла не савецкі бок. Меркаванні Калегіі НКЗС СССР зыходзіла з агульнага міжнароднага становішча і выклікала б пагаршэнне савецка-германскіх адносін. Таму Б. С. Стаманякоў раіў паўнамоцнаму прадстаўніку СССР у Польшчы паступова прыпыніць перагаворы па заключэнні пакта і актывізаваць працу па падрыхтоўцы гандлёвага дагавора [2, с. 236].

Дадатковым штуршком да актывізацыі савецка-польскіх перагавораў стала падпісанне 27 жніўня 1928 г. пакта Брыяна-Келага (Парыжскі пакт) па стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі і Маскоўскага пратакола ў лютым 1929 г. У лісце Д. В. Багамолава Б. С. Стаманякову ад 29 мая 1928 г. указвалася, што «палякі баяцца, што пакт Келага (да таго ж без іх удзелу) створыць глебу для рэвізіі ў бліжэйшым будучым Версальскага дагавора. Таму растуць іх апасенні за заходнія межы. Як кампенсацыя за пераглядь і выпраўленне заходніх межаў Германіі прапаноўваюцца якіясьці «гарантыі» супраць СССР. У цяперашні момант я лічу, што пытанне аб якім-небудзь пераглядзе ўсходніх межаў Польшчы неактуальна, бо ўся польская грамадская думка была бы супраць яго» [2, с. 316].

У лісце намесніка народнага камісара замежных спраў СССР М. М. Крэсцінскага У. А. Антонаву-Аўсеенку ад 22 кастрычніка 1930 г. указвалася аб змесце яго сустрэчы з С. Патэкам (зандаж глебы адносна пытання заключэння пакта аб ненападзенні). Польскі дыпламат указваў, што «нашы перагаворы аб заключэнні пакта аб ненападзенні сутыкнуліся з 4 перашкодамі. Першай быў Статут Лігі Нацый, які забараняў Польшчы прымаць на сябе абавязкі безумоўнага нейтралітэта. Другая заключалася ў нашым нежаданні дамаўляцца адначасова з Польшчай і іншымі прыбалтыйскімі дзяржавамі. Трэцяя зводзілася да нашага нежадання ўключыць у пакт і Румынію. Чацвёртая цяжкасць была ў нашых адмоўных адносінах да арбітражу. С. Патэк лічыць, што першая перашкода адпадае, калі пакт Келага будзе ўзгоднены з Статутам Лігі Нацый. Што датычыцца другой і трэцяй перашкоды, то яны верагодна, не з'явяцца ўжо перашкодай, бо мы пагадзіліся на адначасовае падпісанне з Польшчай, прыбалтамі і Румыніяй Маскоўскага пратакола. Пытанне ж аб арбітражу здымуць самі палякі, ідучы па прымальнаму для нас шляху ўзгадняльнай працэдуры» [2, с. 504].

У лісце народнага камісара замежных спраў СССР М. М. Літвінава да паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Польшчы У. А. Антонава-Аўсеенкі ад 30 студзеня 1930 г. адзначалася, што падчас яго сустрэчы з С. Патэкам стала зразумела, што «ніякія змены ў пазіцыі польскага ўраду ў адносінах да СССР не адбылося і што ваша паведамленне аб такіх зменах ён лічыць вынікам вашага аптымізму і па-другое, Польшча як і раней лічыць заключэнне пакта аб ненападзенні празмерным і непатрэбным і, па крайней меры, будзе настойваць інтэгральна на раней выстаўленыя ёю умовы». «У выпадку сапраўднага імкнення з боку Польшчы да радыкальных зменаў усёй яе палітыкі, адмовы ад мараў Пілсудскага аб стварэнні вялікай Польшчы за кошт Украіны, Беларусі і Літвы і яе гатоўнасці да заключэння пакта аб ненападзенні і расцэньвання намі такога пакта ў якасці сапраўднай гарантыі міра на бліжэйшыя гады – паўстала б пытанне, ці не трэба нам пераглядзець сваю палітыку і ахвяраваць у некаторай ступені нашымі цяперашнімі адносінамі з Германіяй» [2, с. 538–539].

16 снежня 1931 г. адбылася сустрэча прадстаўніка Польшчы ў Маскве С. Патэка і М. М. Літвінава адносна выпрацоўкі праекта дагавора аб ненападзенні. У выніку абмяркоўваўся польская прапанова па ўтварэнні Узгадняльнай камісіі, якая павінна будзе займацца вырашэннем спрэчных пытанняў. якія ўзніклі ў працэсу выканання Рыжскага мірнага дагавора. У сваю чаргу народны камісар замежных спраў СССР выказаўся супраць гэтага варыянта. На думку М. М. Літвінава, яе пасяджэнні не будуць мець канкрэтных вынікаў, як доказ прыводзіцца прыклад працы Змешанай узгадняльнай камісіі па вырашэнні пагранічных інцыдэнтаў, дзе 75 % разгледжаных спраў засталіся без адказу. У сваю чаргу С. Патэк адзначыў, што «ў Польшчы маецца шэраг прэтэнзій адносна нібыта невыканання з нашага боку некаторых матэрыяльных пастаноў Рыжскага дагавора. У савецкага боку маюцца прэтэнзіі адносна дапушчэння на тэ-

рыторыю Польшчы дзейнасці ўрада Пятлюры і розных белагвардзейскіх арганізацый, маюцца прэтэнзіі за «рэйды» з польскай тэрыторыі. Калі мы і польскі бок перадасць усе гэтыя прэтэнзіі ва ўзгадняльную камісію, то зразумела, што яна не зможа абсалютна нічога зрабіць з імі, яны толькі прывядуць да абвастрэння ў нашых адносінах. Такім чынам падпісваючы пакт аб ненападзенні і ажыццяўляючы крок наперад, мы адначасова прыйдзем да новых і сур'ёзных цяжкасцей, тым самым зробім два крокі назад» [2, с. 640].

У сакрэтным лісце члена Калегіі НКЗС СССР Б. С. Стаманякова да У. А. Антонава-Аўсеенкі ад 30 снежня 1930 г. акрэслівалася ўзаемасувязь паміж прапановамі польскага боку па заключэнні пакта аб ненападзенні і станам польска-германскіх адносін. «Словы Залескага не адлюстроўваюць ніякага пералому ў польскай палітыцы ў адносінах да СССР, і што ніякіх сур'ёзных намераў у Пілсудскага ў адносінах да збліжэння з намі і зараз няма. Можа быць размова з польскага боку ідзе аб тым, каб уцягнуць нас у такія несур'ёзныя перагаворы з мэтай, з аднаго боку, аказаць удзеянне на Германію і зрабіць яе больш згаворлівай у адносінах да Польшчы, з другога боку, выклікаць у Германіі недавер да нашых намераў у адносінах да Германіі» [3, s. 353].

У дзённіку сустрэч М. М. Літвінава адносна яго сустрэчы з С. Патэкам 14 лістапада 1931 г. адзначалася, што польскі пасланнік указваў, што «заключаныя Рыжскі дагавор, пакт Келага і Маскоўскі пратакол у дастатковай ступені забяспечваюць мір паміж абодвума краінамі і асаблівай неабходнасці ў чацвёртым пакце няма» [3, s. 590–591]. Тым не менш ён лічыць, што было б карысным заключэнне і пакта аб ненападзенні, калі ён будзе ўключаць новыя моманты. Польскі ўрад цікавіць заключэнне пакта з краінамі па ўсёй лініі ад Фінляндыі да Румыніі уключна.

Нягледзячы на дастаткова скептычную пазіцыю польскага кіраўніцтва, 25 ліпеня 1932 г. быў падпісаны «Дагавор аб ненападзенні» паміж СССР і Польшчай першапачаткова тэрмінам на 3 гады, але ўжо 5 мая 1934 г. працягнуты да 31 снежня 1945 г. [4, с. 607]. Па дагаворы бакі прызнавалі суверэнітэт, узаемныя межы і тэрытарыяльную цэласнасць адзін аднаго. У лісце паверанага ў справах СССР у Польшчы Б. Г. Падольскага намесніку народнага камісара замежных спраў СССР М. М. Крэсцінскага ад 28 ліпеня 1932 г. указвалася, што 2амаль уся польская прэса з адухаўленнем адклікнулася на падпісанне пакта, як тут кажуць «Патэк-Крэсцінскага». Разам з апублікаваннем самога факта падпісання, у цэлым шэрагу артыкулаў размешчаны каментарыі, якія асвятляюць значэнне гэтага акта для Польшчы. Усе прызнаюць значнасць паляпшэння адносін паміж Польшчай і СССР. Аднак гэта не паўсюль аднолькава» [5, с. 223].

Савецка-польскія перагаворы па падрыхтоўцы і заключэнні «Дагавора аб ненападзенні» 25 ліпеня 1932 г. і узгадняльнай канвенцыі, якія цягнуліся з 1925 г. па 1932 г., яскрава прадэманстравалі жаданне савецкага кіраўніцтва па выкарыстанні двухбаковых перагавораў у паляпшэнні гандлёва-эканамічных адносін Польшчы і СССР; і польскага кіраўніцтва

на захаванні цэласнасці савецка-польскай мяжы. Дзеля дасягнення кампрамісу бакі імкнуліся пэўны час залагоджваць спрэчныя двухбаковыя пытанні (праблема свабоднага культурнага і рэлігійнага развіцця нацыянальных меншасцей, ліквідацыі антысавецкіх элементаў у Польшчы).

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945 / red. serii M. Wołos. – T. II: 1926–1932. – Cz. 1: Trudne lata (czerwiec 1926 – luty 1929). – Warszawa, 2022. – 950 s.
2. Советско-польские отношения в 1918–1945 гг. : сб. док. в 4 т. / под общ. ред. С. А. Скляров, М. С. Павловой. – М.: Аспект Пресс, 2017. – Т. 2: 1926–1932. – 630 с.
3. Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945 / red. serii M. Wołos. – T. II: 1926–1932. – Cz. 2: Na drodze ku stabilizacji (luty 1929 – lipiec 1932). – Warszawa, 2022. – 950 s.
4. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – Т. 5: 1926–1932 гг. – М., 1967. – 616 с.
5. Советско-польские отношения в 1918–1945 гг. : сборник документов в четырех томах / под общ. ред. М. М. Наринского, Н. Е. Клейменовой, С. А. Склярова. – М. : Аспект Пресс, 2017. – Т. 3: 1932–1939. – 637 с.